**В. А. Міхедзька**

# ПРАБЛЕМА ВЫЗНАЧЭННЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ПРЫНАЛЕЖНАСЦІ БЕЛАРУСКАГА НАСЕЛЬНІЦТВА ПАЎНОЧНА-ЗАХОДНЯГА КРАЯ Ў КАНТЭКСЦЕ ЎРАДАВАЙ ПАЛІТЫКІ 60-Х ГАДОЎ ХІХ – ПАЧАТКУ ХХ СТАГОДДЗЯ

Адным з ідэалагічных абгрунтаванняў урадавых мерапремстваў у Паўночна-Заходнім краі падчас і пася паўстання 1863–1864 гг. сталася сцвярджэнне неабходнасці абароны ад “польскага прыгнёту” мясцовых праваслаўных сялян. У барацьбе з “пальшчызнай” і “лацінствам” віленскі генерал-губернатар М. М. Мураўёў выратаваў гэтае насельніцтва і, як пісаў Ф. Цютчаў, “бедное, замученное племя, / воздвигнув к жизни, вынес на себе” [1, с. 150]. Пры гэтым сам Мураўёў, азначаючы нацыянальную прыналежнасць мясцовых праваслаўных, пастуліраваў прыналежнасць гэтага “племені” да рускага народа – “сельское население в душе русское, но загнано и забито” [2, с. 497]. Праваслаўе і “руская народнасць” для М. Мураўёва стваралі адзіную непарыўную цэласць. Погляды М. Мураўёва на нацыянальную прыналежнасць мясцовых праваслаўных падзяляў і складальнік “Этнаграфічнага атласа заходне-рускіх губерняў...” Р. Эркерт. Ён сцвярджаў: “у заходняй Расіі, з параўнальна нешматлікімі выключэннямі, усе славянскія мешканцы праваслаўнага веравызнання павінны лічыцца Рускімі, а ўсе тыя, якія спавядаюць каталіцкую рэлігію, – Палякамі”. У той жа час, ён папярэджваў ад занадта шырокіх абагульненняў: “Гэты спосаб гледжання не ва ўсіх выпадках і не абсалютна правільны (для Валынскай, Падольскай і Кіеўскай губерняў ён больш правільны, чымсьці для Беларускіх губерняў). Р.Эркерт заўважаў, што калі за падставу падзелу “паляк-рускі” прыняць толькі мову, дык колькасныя суадносіны паміж імі значна змяніліся бы на карысць “рускага насельніцтва” края [3, с. 6]. Тым не менш, Р. Эркерт усё ж такі падкрэсліваў перавагі канфесійнага крытэрыя вызначэння нацыянальнай прыналежнасці: “гістарычная хада падзеяў адбіла ва ўсіх адносінах на рускім насельніцтве заходніх губерняў пэўны чужынскі тып, які рэзка адрозніваецца ад карэннай, цалкам-рускай … каталік, які гаворыць на беларускай альбо маларускай мове, не толькі ў вачох усіх жыхароў праваслаўнага і каталіцкага веравызнання – Паляк, але і сам лічыць сябе, ды і хоча, каб іншыя яго лічылі Палякам” [3, с. 7–8]. Пры тым, што Р. Эркерт выкарыстоўваў азначэнне “беларусы” як назву аднаго з

“пляменаў” рускага народа, ён адмаўляў магчымасць афіцыйнага выкарыстання гэтай назвы як этнічнай: “назва «Беларус» для азначэння народнасці і «беларуская», для азначэння мовы, нікому ў народзе невядомыя” [3, с. 8]. У “Атласе...” А. Рыціха ўсё праваслаўнае насельніцтва вызначана як “рускае”, хаця ў статыстычнай табліцы да яго паказаны падзел “рускіх” на адпаведна “малорусаў”, “беларусаў і чорнорусаў” і “велікарусаў”[4, с. 5].

Вылучэнне асобнай, адрознай беларускай нават не мовы, але “гаворкі”, якую той жа Р. Эркерт разглядаў як магчымы, але непажаданы крытэрый нацыянальнага вызначэння насельніцтва края, выклікала ў самога М. Мураўёва жорсткую адмоўную рэакцыю – “бедственная идея о разъединении народностей в России, введении малороссийского, белорусского и иных наречий уже глубоко проникла в общественные взгляды. Необходимо положить этому твердую преграду…” [5, с. 107]. У рэчышчы прызнання праваслаўя падмуркам прыналежнасці да “рускага народа”, пры М. Мураўёве і, асабліва, пры яго наступніке К. П. Каўфмане адбываліся захады па навяртанні каталіцкіх вернікаў у праваслаўе. Меркавалася, што зварот у праваслаўе здыме праблему нацыянальнай ідэнтыфікацыі, ператвараючы іх у “рускіх” [5, с. 187–191; 6]. Мураўёў нават дазволіў пакідаць на службовых пасадах мясцовых палякаў пры ўмове іх пераходу ў праваслаўе і патлумачыў гэта тым, што “кожны католік, які прыняў праваслаўе, ужо не паляк... а ягоныя дзеці будуць рускімі” [7, с. 344]. Адміністрацыйныя захады па навяртанні беларускіх сялян-каталікоў у праваслаўе выклікалі часам адваротны эфект і замест умацавання “рускай” нацыянальнай самасвядомасці штурхалі “тутэйшых” ў бок польскай самаідэнтыфікацыі. Нягледзячы на гэта, высілкі ваеннага начальніка віленскага павету князя М. М. Хаванскага па пераводу беларускіх сялян-каталікоў у праваслаўе атрымалі асабістую падзяку Аляксандра II [5, с. 239].

З 1880-х гг. у Расійскай імперыі этнавызначальнай прыкметай пачала лічыцца ўжываная насельніцтвам мова. Ва ўмовах хуткага росту насельніцтва ў паслярэформенны перыяд выкарыстанне гэтага крытэрыя нацыянальнай прыналежнасці, як калісь і адзначаў Р. Эркерт, дазваляла моцна павялічыць колькасць «рускамоўных» насупраць «польскамоўным» і пашырыць прастору прэтэнзій улады у фармаванні этнічнга аблічча Расійскай імперыі. Зменам пазіцый улады спрыялі даследаванні этнаграфіі беларускага краю, якія вяліся ў другой палове XIX – пачатку XX ст. і збольшага былі інспіраваныя расійска-

польскім супрацьстаяннем. Моўны прынцып вызначэння беларускага – а для тагачаснай адміністрацыі гэта значыла “непольскага=рускага” – паступова пераходзіў з маргінальных пазіцый да агульнапрызнанага і навукова абгрунтаванага. Значным крокам у практычнай рэалізацыі моўнага крытэрыя нацыянальнай прыналежнасці стаўся Усерасійскі перапіс 1897 г. Табліцы размеркавання насельніцтва губерняў па роднай мове (“родному языку”) змяшчалі графу “Русский язык”, якая, у сваю чаргу, падзялялася на тры графы – “великорусский”, “малорусский” і “белорусский”. Такім чынам, Цэнтральны статыстычны камітэт Міністэрства ўнутраных спраў Расійскай імперыі дэ-факта пазначыў статус беларускай і украінскай (“маларускай”) мовы менавіта як “мовы”, а не “гаворкі” (“наречия”), што напэўна разыходзілася з афіцыйным меркаваннем акадэмічнай навукі. У сукупнасці са звесткамі аб колькасці носьбітаў беларускай мовы яе статус набываў новую значнасць для ўладных структур Расійскай імперыі. Нават у аддаленых ад Паўночна-Заходняга края губернях носьбіты беларускай мовы складалі заўважную колькасць. Так, нарыклад, у Ніжагародскай губерні яны сярод носьбітаў славянскіх моваў саступалі па колькасці велікарусам, зусім нязначна саступалі па колькасці носьбітам польскай мовы, але значна пераважалі “маларускую” моўную супольнасць і іншыя славянамоўныя супольнасці губерні. Варта адзначыць, што сярод тых жыхароў Ніжагародскай губерні, што пазначылі сваёй роднай мовай беларускую, была і незначная меншасць каталіцкага веравызнання [8, с. 66, 71]. Дадзеныя па губернях Паўночна-Заходняга края таксама паказывалі заўважную долю (каля 30 % па Гродзенскай губерні, каля 14 % па Віленскай губерні, каля 9 % па Мінскай губерні, каля 5% па Віцебскай губерні, каля 2 % па Магілёўскай губерні), каталіцкага насельніцтва, якія вызначылі сваёй роднай мовай беларускую, а не польскую [9, с. 102, 107; 10, с. 56, 61; 11, с. 80, 85; 12, с. 76, 81; 13, с. 96, 101]. На пачатку XX ст. гэтыя звесткі ўжо ўвайшлі ў сферу ўвагі мясцовай губернскай адміністрацыі і перад усім – Віленскага генерал-губернатара П. Д. Святаполка-Мірскага. Генерал-губернатар прафінансаваў палявыя даследаванні Я. Ф. Карскага і, мінаючы цэнзурныя перашкоды выданню сабранага матэрыяла, даў асабісты дазвол на друк у 1903 г. першага тома серыі “Беларусы”, дадаткам да якога сталася “Этнаграфічная карта беларускага племені”. П. Д. Святаполк-Мірскі, разглядаючы беларускае насельніцтва як рэсурс у змаганні з “пальшчызнай”, звяртаў увагу Мікалая II на магчымасць выкарыстання беларускага фактара для замацавання расійскага панавання у краі:

“…у асяроддзі каталіцкіх беларусаў ужо пачынае праяўляцца плынь на карысць адасаблення ад палякаў, плынь, якая відавочна патрабуе падтрымкі з боку ураду” [14, арк. 30].

На пачатку XX ст. моўны крытэрый вызначэння нацыянальнай прыналежнасці беларускага насельніцтва як “рускага” ужо разглядаўся мясцовай адміністрацыяй як факт, які магчыма было супрацьпаставіць прэтэнзіям польскай грамады края. Мінскі губернатар П. Г. Курлаў адзначаў: “у сваіх распараджэннях урад зыходзіў неправільнага стаўлення, што ўсе асобы рымска-каталіцкага веравызнання – палякі, тады як сярод католікаў была маса беларусаў, якія не мелі нічога агульнага з палякамі і нават варожых ім” [15, с. 66]. На пачатку 1914 г. мінскі губернатар А.Ф. Гірс у пададзеным у Савет міністраў мемарыяле пісаў: “беларускі народ рымска-каталіцкай веры – галіна чыста расійскага паходжання. Апрача рэлігіі, гэтыя людзі нічым не адрозніваюцца ад праваслаўных беларусаў...”, што, адпаведна, адкрывала магчымасці іх выкарыстання ва ўрадавых мэтах барацьбы з “пальшчызнай” [16, с. 7].

Такім чынам, магчыма адзначыць, што пошукі і ваганні вакол разумення нацыянальнай прыналежнасці беларусаў, якія на працягу 60-х гадоў XIX – пачатку XX ст. адбываліся ў рэчышчы дзяржаўнай палітыкі ў Паўночна-Заходнім краe, прадэманстравалі ўнутраную няўпэўненасць, супярэчлівасць, а магчыма і няздольнасць расійскай улады да рэалістычнага ўспрымання беларускага насельніцтва.

## Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры


1. Тютчев, Ф. И. Его светлости князю А. А. Суворову / Ф. И. Тютчев // Стихотворения: Москва: Эксмо; 2012. – 606 с.

2. Муравьёв, М. Н. Всеподданейший отчет графа М. Н. Муравьева по управлению Северо-Западным краем / М. Н. Муравьев // Русская старина : ежемесячное историческое издание. – Тип. Т-ва “Общественная польза”. – 1902. – № 6. – С.487–510.

3. Эркерт, Р. Ф. Взгляд на историю и этнографию западных губерний России : (с атласом) / [соч.] Полк. Р. Ф. Эркерта. – Санкт-Петербург : Тип. Дома призрения малолет. бедных, 1864. – 72 с.

4. Риттих, А. Ф. Атлас народонаселения Западно-Русского края по исповеданиям: составлен при Министерстве внутренних дел в Канцелярии заведывающего устройством православных церквей в западных губерниях / А. Ф. Риттих. – Санкт-Петербург : Типогр. В. Веллинга, 1864. – 9 л.

5. Комзолова, А. А. Политика самодержавия в Северо-Западном крае в эпоху Великих реформ / А. А.Комзолова. – Москва : Наука, 2005. – 383 с.

6 Ганчар, А. И. Обращение римско-католического населения Беларуси в православие (60-е гг. XIX в.) / А. И. Ганчар / [Электронный ресурс]. – Рэжым доступа: https://elib.ggau.by//handle/123456789/2338. – Дата доступа: 10.10.2023.

7. Бутковский, Я. Н. Из моих воспоминаний / Я. Н. Бутковский // Исторический вестник : историко-литературный журнал. – Т. 14, ноябрь. – 1883. – С. 325–366.

8. Первая Всеобщая перепись населения Российской империи 1897 г. : под редакцией Н. А. Тройницкого. – Санкт-Петербург : издание Центрального статистического комитета Министерства внутренних дел: XXV : Нижегородская губерния. – Тетрадь 2. –1904. – 227 с.

9. Первая Всеобщая перепись населения Российской империи 1897 г. : под редакцией Н. А. Тройницкого. – Санкт-Петербург : издание Центрального статистического комитета Министерства внутренних дел: XI : Гродненская губерния. – 1904. – 319 с.

10. Первая Всеобщая перепись населения Российской империи 1897 г. : под редакцией Н. А. Тройницкого. – Санкт-Петербург : издание Центрального статистического комитета Министерства внутренних дел: IV : Виленская губерния. – Тетрадь 3. – 1904. – 179 с.

11. Первая Всеобщая перепись населения Российской империи 1897 г.: под редакцией Н. А. Тройницкого. – Санкт-Петербург : издание Центрального статистического комитета Министерства внутренних дел : XXII : Минская губерния. – 1904. – 243 с.

12. Первая Всеобщая перепись населения Российской империи 1897 г. : под редакцией Н. А. Тройницкого. – Санкт-Петербург : издание Центрального статистического комитета Министерства внутренних дел: V : Витебская губерния. – Тетрадь 3. – 1903. – 283 с.

13. Первая Всеобщая перепись населения Российской империи 1897 г. : под редакцией Н. А. Тройницкого. – Санкт-Петербург : издание Центрального статистического комитета Министерства внутренних дел: XXIII : Могилевская губерния. – 1903. –276 с.

14. Отчет виленского генерал-губернатора П. Д. Святополка-Мирского от 20 мая 1904 года // Российский государственный исторический архив. – Ф. 1284. Оп. 194. Д. 136.

15. Курлов, П. Г. Гибель Императорской России / П. Г. Курлов. – Москва : Современник, 1992. – 255 с.

16. Докладная записка “О мерах, могущих укрепить национальное самосознание белоруссов и противодействовать их полонизации” минского губернатора Гирса // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Фонд 60. Воп. 3. Спр. 114.

**Н. С. Моторова**

## РАЗВИТИЕ СОЦИАЛЬНОГО СТРАХОВАНИЯ В БЕЛОРУССКИХ ГУБЕРНИЯХ В НАЧАЛЕ XX ВЕКА

В начале XX в. в структуре социальной политике Российской империи социальное страхование стало одним из ключевых элементов государственной социальной политики. Его основная задача заключалась в материальном обеспечении наемных рабочих в случае утраты трудоспособности.

В белорусских губерниях, как в целом в Российской империи, становление системы социального страхования выразилось в законодательном закреплении прав рабочих на получение компенсационных выплат в случае получения травм или смерти на производстве. Соответствующие правила были утверждены в 1903 г., а их действие распространялось на предприятия фабрично-заводской, горно-заводской и горной промышленности. Их владельцы обязаны были возместить расходы на лечение и погребение рабочих, пострадавших от несчастных случаев на производстве. Они также должны были выплачивать пенсии и пособия пострадавшим или членам их семей. Если владельцы предприятий застраховали своих рабочих, то соответствующие выплаты ложились на страховые общества. Максимальный размер пособия мог составлять до половины заработка пострадавшего рабочего. Оно назначалось с момента несчастного случая и выплачивалось до восстановления трудоспособности либо признания ее полной утраты. Максимальный размер пенсии мог составлять до двух третей заработка рабочего. Она назначалась при полной утрате трудоспособности. В случае смерти пострадавшего рабочего пенсию могли получать члены его семьи, но в сокращенном размере [5, с. 595, 600–601, 606].

Размеры компенсационных выплат были значительно меньше размеров заработков пострадавших рабочих. По данным за 1908 г. фабричные инспекции белорусских губерний заключили соглашения по 138 несчастным случаям, произошедшим на производстве, с назначением пенсий. Ее средний размер составил чуть более 32 руб. В то же время среднегодовой заработок пострадавших рабочих превышал